Viestki550.qxd 11/28/2011 2:06 AM Page 1 (3,1)




# Весткі й Паведамленьні

*інфармацыйны бюлетэнь*

**Viestki j Paviedamlenni**

Сусьветнае сеціва: ***www.baza-belarus.org, e-krama.com***

✉ ***viestki@mail.com***

№ 12 (550)
Сьнежань 2011 г.


# Прэзэнтацыя альманаху “БЕЛАРУС” за 2012 г.

Прэзэнтацыя апошняга нумару літаратурнага альманаху беларускіх пісьменьнікаў замежжа “Беларус” за 2011 год адбылася на чарговым лістападаўскім сходзе арганізацыі былога (*бяручы пад увагу апошнюю пастанову Галоўнай управы БАЗА, якая выключае Нью-Ёрскі аддзел з структуры арганізацыі*) аддзелу БАЗА ў Нью-Ёрку, што па традыцыі прайшоў у Доме Маракоў на Мангэтане 12 лістапада.




Вёў імпрэзу заснавальнік і выдавец альманаху Марат Клакоцкі. У сваёй нядоўгай прамове ён распавёў удзельнікам сходу аб тым, калі і як узьнікла ідэя падобнага выданьня, і як яна была рэалізаваная ў жыцьцё. Прамоўца нагадаў крытэры, па якіх падбіраюцца аўтары і творы для альманаху, а таксама аб тым, на якія сродкі гэтае выданьне пабачыла свой вось ужо пяты нумар.

Пяць гадоў – немалы тэрмін для штогадовіка, і мала хто верыў у 2007 годзе, што справа гэтая ня спыніцца пасьля аднагодвух нумароў. За гэтыя гады склалася і пэўная традыцыя правядзеньня самой прэзэнтацыі, на якую запрашаюцца ўсе аўтары, чые творы былі надрукаваныя ў альманаху. Безумоўна, далёка ня кожны з нашых літаратараў можа дазволіць сабе вандроўку ў Нью-Ёрк, хай сабе і на такую важную імпрэзу. Асабліва калі ўлічыць, што свае творы для друку ў “Беларусе” даслалі 19 аўтараў зь 10 краінаў сьвету. Сёлета прэзэнтацыю ў Нью-Ёрку змаглі наведаць чатыры зь іх: Віталь Зайка, Уладыка Юры (Рыжы), Сяржук Сокалаў-Воюш і Валянціна Якімовіч. Кожны з аўтараў меў магчымасьць распавесьці зацікаўленым слухачам аб сваіх творах, гісторыі іх стварэньня. Усе зь іх таксама сыходзіліся ў думцы, што выданьне трэба абавязкова працягваць у будучым. Уладыка Юры падкрэсьліў важнасьць літаратурнага альманаху, як праявы актыўнасьці і неабыякавасьці нашых суродзічаў, што апынуліся на чужыне.

Пасьля выступу аўтараў вядучы імпрэзы папрасіў выступіць запрошанага на прэзэнтацыю Старшыню БНФ “Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай партыі – БНФ Зянона Пазьняка. Вядомы палітык гэтым разам гаварыў аб важнасьці і запатрабаванасьці выданьня кшталту літаратурнага альманаху, праз які маюць магчымасьць данесьці свае творы да чытачоў літаратары, што жывуць у замежжы і пішуць па-беларуску. Сп. Пазьняк таксама пагадзіўся з Уладыкам Юрыем і адзначыў важнасьць выданьня, як сьведчаньня шырокай беларускай прысутнасьці ў ЗША і сьвеце, асабліва з улікам таго, як шырока ён рассылаецца па бібліятэках і навучальных установах.

Потым усе мелі магчымасьць задаць выдаўцу і аўтарам пытаньні, атрымаць на іх адказы, а таксама набыць асобнік альманаха з аўтографамі пісьменьнікаў.

Хочацца падзякаваць усім, хто прыйшоў на імпрэзу (а прысутных было каля 100 чалавек), а таксама кожнаму, хто набыў “Беларус” і гэтым падтрымаў яго фінансава. Жадаючых набыць новае выданьне выстраілася цэлая чарга, што яшчэ раз засьведчыла ягоную папулярнасьць і ўмацавала надзею на тое, што “Беларус” за 2012 год таксама пабачыць сьвет.

***Прысутны***

*Тыя, хто не патрапілі на прэзэнтацыю, могуць набыць апошні нумар, гэтак як і ўсе папярэднія, у інтэрнэце, наведаўшы старонку **e-krama.com** і зрабіўшы аплату крэдытнаю ці банкаўскаю карткаю альбо праз Paypal. На сайце можна таксама зрабіць ахвяраваньне на наступны нумар.*

# Альманах “БЕЛАРУС” прэзэнтавалі ў Празе

У Празе (кавярня Krasne Ztraty) 12 лістапада адбылася прэзэнтацыя сёлетнега альманаху “Беларус” (Нью-Ёрк). Я чытаў непублікаваныя мініятуры і парушаў балючыя тэмы, а Макс Шчур чытаў вершы і засьпяваў колькі сваіх і перакладзеных ім песьняў.

У якасьці гасьцей слова ўзялі літаратар Лявон Юрэвіч зь Нью-Ёрку і гісторык Натальля Гардзіенка зь Менску, якія апавялі пра альманах “Беларус” і пра дзейнасьць БІНІМу.

***Віталь ВОРАНАЎ***



***На здымку:*** *аўтары альманаху і арганізатары прэзэнтацыі ў Празе Макс Шчур і Віталь Воранаў.*

Viestki550.qxd 11/28/2011 2:06 AM Page 3 (1,1)



# Лістападаўскі сход арганізацыі былога Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА

У суботу, 12 лістапада, у Доме Маракоў на Мангэтане адбыўся чарговы сход арганізацыі былога Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА. Напачатку сходу старшыня аддзелу Віталь Зайка, выступіў з кароткай гутаркай пра 91-я ўгодкі Слуцкага Збройнага Чыну, што адзначаюцца ў гэтым месяцы 27 лістапада на Дзень Герояў. Прамоўца коратка нагадаў пра агульны гістарычны фон таго часу і пра асноўныя падзеі слаўнага змаганьня нашых папярэднікаў за волю і незалежнасьць Бацькаўшчыны ў 1918-1920 гг.

Калі ўвосень 1920 году стварылася мажлівасьць самастойнага вырашэньня свайго лёсу, жыхары Случчыны ўзялі ў свае рукі ўладу на абшары павету і прылеглых земляў, абралі Раду Случчыны і пастанавілі са зброяй у руках адстойваць свабоду свайго краю й ідэалы Акту 25 Сакавіка 1918 г. Былі створаны збройныя сілы – Слуцкая брыгада ў складзе некалькіх палкоў. У няроўным змаганьні з пераўзыходзячымі бальшавіцкімі сіламі случчакі здолелі мужна і самаахвярна змагацца за сваю зямлю, затрымалі на месяц наступ Чырвонай арміі. Нягледзячы на непараўнальную розьніцу вайсковае моцы, слуцкія змагары паказалі волю да свабоды і незалежнасьці краю, даказалі што беларускі селянін і месьціч, перакананыя ў ідэях нацыянальнага вызваленьня, здольныя бараніць сябе і свой край, не шкадуючы крыві й жыцьця. Справа случчакоў не загінула і дасюль паказвае нам узор ахвярнага служэньня Бацькаўшчыне-Беларусі. Прысутныя ўшанавалі памяць герояў Слуцкага Збройнага Чыну хвілінай цішы.

Затым з прачуленым, эмацыйным чытаньнем вершаў, прысьвечаных памяці слуцкіх герояў, выступіла сакратар аддзелу сп-ня Валянціна Якімовіч. Вершы Натальлі Арсеньневай у яе выкананьні кранулі і ўзрушылі ўсіх прысутных.

З аналізам падзеяў апошняга часу ў Беларусі перад прысутнымі выступіў Старшыня Беларускага Народнага Фронту Зянон Пазьняк. Ён перакінуў масток ад падзеяў 1920 году і Слуцкага змаганьня да нашых дзён, адзначыўшы, што мужнасьць і ахвярнасьць случчакоў ёсьць прыкладам для ўсіх



**В. Зайка.** *Здымак А. Дубавой.*

пакаленьняў сьведамых беларусаў. Аднак цяпер у краіне і ў сьвеце іншая сытуацыя, чым у 20-я гады мінулага стагодзьдзя. Змаганьне працягваецца, мэты яго застаюцца падобнымі, але яно ідзе іншымі мэтадамі і ў іншых умовах. Цяперашнія падзеі ў Беларусі адлюстроўваюць ход і ўплыў сусьветных падзеяў. Сёнешняй зброяй, замест колішніх кулямётаў і гарматаў, ёсьць інфармацыйная насычанасьць, здольнасьць праз словы й факты давесьці сэнс і лёгіку дасягненьня сапраўднай свабоды і незалежнасьці для Беларусі максымальнаму ліку яе грамадзянаў.

Затым прамоўца закрануў пазыцыю сёнешняй улады ў Беларусі да свайго народу. Інакш як фашыстоўскай яе назваць цяжка. За пэўны мінімальны ўзровень дабрабыту людзям было жорстка прапанавана адмовіцца ад вырашэньня справаў, зьвязаных з палітыкай і курсам дзяржавы. Усіх нязгодных чакаюць рэпрэсіі і перасьлед. Фактычна ўлады распачалі 19 сьнежня летась новы этап вайны супраць жыхароў Беларусі, і гэта працягваецца па сёнешні дзень.

Сп. Пазьняк нагадаў асноўныя палітычныя падзеі бягучага году ў Беларусі, ахарактэрызаваў

***Заканчэньне на бач. 4***



*Здымак А. Лук'янава.*

Viestki550.qxd 11/28/2011 2:06 AM Page 3 (3,1)



# Шчыра віншуем

**Вольгу КАЗАК і Каана АНЛАРА з законным шлюбам і зычым здароўя, шчасьця, творчых посьпехаў, каб былі між вамі любоў ды савет, каб у кожным куточку было па сыночку, а пасярод хаткі бегалі дзяўчаткі!**

Сёлета 15 кастрычніка Вольга Казак пабралася шлюбам з Каанам Анларам, які дагэтуль амаль тры гады дабіваўся яе рукі. Ён нават збольшага разумее і размаўляе па-беларуску. Вясельле адбылося на верхнім Мангэтане ў турэцкім рэстаране “Turkuaz”. Было запрошана каля ста асобаў, сярод якіх былі родныя, блізкія, сябры, добрыя знаёмыя і супрацоўнікі маладажонаў. Было ўтульна, шмат розных страваў на любы смак. Нягледзячы на тое, што сабралася шмат незнаёмых між сабою людзей, панавала вельмі цёплая атмасфэра.

Нявеста выглядала асьляпляльна прыгожай і шчасьлівай. Бацька нявесты Алесь Казак з хваляваньнем перадаў руку дачкі жаніху. Маладыя далі адзін аднаму абяцаньне любові й вернасьці, абручыліся пярсьцёнкамі й замацавалі гэта дзеяньне пацалункам. Ва ўсіх захапіла дыханьне, калі нечакана Вольга пяшчотна правяла рукою па твары Каана, і яны вельмі прыгожа й плястычна выканалі свой складаны першы шлюбны танец. Пасьля пачалі таньчыць госьці. Было шмат ўсялякіх танцаў і турэцкіх, і беларускіх. Сьпявала сама нявеста па-беларуску, па-ангельску, і госьці яшчэ раз пераканаліся ў таленавітасьці нявесты. Пасьля выкананьня песьні: “Беларусь – радзіма мая”, якую па-беларуску падпяваў і Каан, ды, як маглі, і прысутныя, танцы перапыніліся.

Маці нявесты Валянціна Пархоменка паслала першы вышываны палескі ручнік на падлозе, і маладыя сталі на яго. Другім беларускім ручніком яна зьвязала маладым рукі. Са снапом ў руках выйшла каравайніца Марыя, за ёй тры дзяўчынкі ў белых сукеначках, падпаясаныя чырвонымі паскамі зь белымі вяночкамі на галоўках і праваслаўнымі абразамі ў рукох, сьледам сын каравайніцы Алесь з караваем на тканым ручніку. Маладыя пацалавалі каравай. Потым, сьледам за каравайніцай, маладыя тройчы абыйшлі вакол каравайнага стала, зноў пацалавалі каравай, адламалі ад яго па кавалачку, пасалілі і зьелі. Пакуль той каравай дзялілі, бацькі нявесты Валя і Алесь засьпявалі вясельныя беларускія песьні такімі галасамі і так прыгожа, што ажно валасы на рукох паўздымаліся.

Калі ж маладая танцорка пачала выконваць турэцкі танец жывата, то гледачы не маглі адарваць вачэй. А тая запрашала з залі на танец і гасьцей. Нечакана надзвычай прыгожа пасвойму станчыла разам зь ёю Тацьцяна Магаліф, а побач з маладзенькімі дзяўчаткамі давала жару Яра Тумаш. Калі турэцкая танцорка, віртуозна бразгаючы сваімі маністамі на аголеных клубах, запрасіла на танец Алеся Казака, той не разгубіўся, хоць вядома ж яму ніколі не даводзілася выконваць падобных танцаў, расправіўшы рукі, неяк заліхвацкі, па-мужыцку з прытупам, гэтак закружыўся вакол яе, што выглядаў вельмі натуральна і гарманічна побач зь ёю.

Не пераставалі мігаць ўспышкі фатакамэраў. Вядомаму беларускаму фатографу Алесю Крыштаповічу не было часу на застольле. Размаўляючы ўдвох, мы адзначылі, што асабіста нам зь ім не патрабуецца ўся гэтая разнастайнасьць прыгатаваных страваў – было б даволі простай варанай бульбачкі ды агурка з салам. Але гэта ўжо нашыя мроі. Што й казаць, вясельле было прыгожым і шыкоўным.

**Валянціна ЯКІМОВІЧ**



Viestki550.qxd 11/28/2011 2:10 AM Page 1 (1,1)



# Лістападаўскі сход

### Заканчэньне з бачыны 2

няўстойлівую, схільную да параноі асобу Лукашэнкі, якую сп. Пазьняк асабіста меў нагоду назіраць напачатку 1990-х гадоў. Далей прамоўца падкрэсьліў неабходнасьць гадаваць і берагчы моладзь, у якой знаходзяцца ключы да будучыні краіны. Цяпер галоўны націск павінен быць на адукацыю, у тым ліку пашырэньне ведаў пра Беларусь, яе мову і культуру, гісторыю і дзяржаўнасьць. У Беларусі не павінна быць праліцьця крыві, здабыцьцё ўлады мусіць адбыцца цывілізавана, па мажлівасьці негвалтоўным чынам. У грамадстве паволі, але няўхільна, ідзе рост нацыянальнай сьведамасьці, і ў гэтым, а таксама ў энэргіі нашай моладзі і ў пашырэньні праўды аб рэжыме Лукашэнкі, тоіцца зарука нашае перамогі.

Наступным пунктам парадку дня была прэзэнтацыя альманаху "Беларус" за 2011 год, якую адкрыў яго выдавец, а таксама рэдактар бюлетэня "Весткі й Паведамленьні" Марат Клакоцкі. (*Гл. артыкул на першай бачыне.*)

Затым адбыліся знаёмствы з гасьцямі аддзелу, прагучэлі аб'явы й паведамленьні. Сход сабраў рэкордную за апошнія часы колькасьць удзельнікаў – каля 100 чалавек.

***Віталь ЗАЙКА***

# Не забуду, што я беларуска

Беларусь... Як шмат значыць гэтае слова для нас – яе дзяцей. Гэта і родныя, знаёмыя зь дзяцінства краявіды, і прыгожыя, працавітыя, сьціплыя людзі. Гэта і родны дом, у якім нарадзіўся, і мілагучная маміна мова, і сьцежка, па якой пайшоў упершыню, і клёкат буслоў... Усё гэта і шмат чаго іншага – "Беларусь мая сінявокая".

Жылі мы на гэтай чароўнай, багатай зямлі і за штодзённымі клопатамі не заўважалі яе хараства і па-сапраўднаму адчулі Радзіму толькі ўдалечыні ад яе. Як хочацца пачуць гучаньне роднай мовы, убачыць роднае неба, удыхнуць роднага паветра.

Я вельмі люблю сваю Беларусь, мне дарагі кожны яе куточак. Болем у сэрцы адгукаецца любая бяда маіх землякоў, а тым больш – чарнобыльская. Мой лёс быццам бы не закрануў Чарнобыль, але мне заўсёды вельмі цяжка чытаць старыя добрыя кнігі, дзе апісваюцца маляўнічыя куткі нашага Палесься. Ня верыцца, што там цяпер атручаная вада, прагорклая зямля, што там ня могуць нармальна жыць людзі. Балюча ўсведамляць, што нашыя дзяды і бацькі памятаюць Палесьсе, як маляўнічы куток некранутай прыроды. А што запомніцца нам? На сваіх новых мапах замест знаёмых, родных назваў шматлікіх населеных пунктаў на поўдні краіны мы будзем пісаць: "зона адсяленьня" і абводзіць гэту зямлю тлустай чорнай лініяй. Мы пакінем яе на доўгія-доўгія гады...

У роспачы хочацца крыкнуць: "Божа! За што ты пакараў гэтую зямлю, пакараў наш народ?" Бог пакараў нас ня толькі Чарнобылем, але і бяспамяцтвам. Баліць душа, калі бачыш, як самі беларусы зьневажаюць сваю зямлю, топчуць уласную спадчыну. Але я ведаю: што б ні здарылася, я заўсёды буду любіць свой край – родную Беларусь – ніколі не забуду, што я беларуска.

***Натальля ГАРДЗЕЕНАК***

### Уплаты ў арганізацыю
Складкі й ахвяраваньні:

| | |
|---|---|
| **В. Блоцкі** | **50** |
| **В. Бобух** | **50** |
| **М. Волкава** | **50** |
| **К. Ермакоў** | **50** |
| **В. Змушка** | **50** |
| **А. Кавальчук** | **50** |
| **Д. Касабуцкі** | **50** |
| **К. Кірсанава** | **50** |
| **К. Масяйчук** | **50** |
| **Г. Нехнядовіч** | **50** |
| **Ю. Новікаў** | **50** |
| **Ю. Пятроўскі** | **50** |
| **Н. Ратош** | **50** |
| **Т. Саланко** | **50** |
| **У. Церын** | **50** |

**Усім шчыры дзякуй!**

**Уплаты ў аддзел шліце на адрас:**
*P. O. Box 572*
*New York, NY 10113*
**Чэкі выпісвайце на імя**
*Valentina Balashchenko.*

Прыносім прабачэньне сп. **Івану Вінчэлю** за памылку ў напісаньні прозьвішча ў папярэднім нумары.

# Наступны сход

арганізацыі былога Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца **ў суботу 10-га сьнежня 2011 г.** на Мангэтане.

Месца правядзеньня сходу:

***Seafarers and International House***
***123 East 15th Street***
***New York, NY 10003.***

*Даезд цягнікамі падземкі* ***L, N, Q, R, W, 4, 5, 6*** *да станцыі* ***Union Square****.*

*Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад Union Square па 15-й вуліцы на скрыжаваньні з Irving Place.*

***Сход гэтым разам пройдзе ў капліцы на першым паверсе.***

Пачатак: **а 6:00-й** вечара.

-------------------

*Аб месцы і часе правядзеньня сходаў ды іншых імпрэзаў, ладжаных арганізацыяй, можна даведацца, наведаўшы ў інтэрнэце ўэбстаронку* ***www.baza-belarus.org***

*Паважаныя* ***А. Бабкова, В. Бандарэнка, Ю. Залепужына, Н. Кавалеўская, І. Пікалюк, П. Шандра*** *паведаміце, калі ласка, рэдакцыі вашыя дакладныя паштовыя адрасы.*

### Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

| | |
|---|---|
| **В. Бобух** | **30** |
| **В. Блоцкі** | **30** |
| **Н. Волкава** | **30** |
| **К. Ермакоў** | **30** |
| **В. Змушка** | **30** |
| **А. Кавальчук** | **30** |
| **Д. Касабуцкі** | **30** |
| **К. Кірсанава** | **30** |
| **А. Лук'янаў** | **30** |
| **К. Масяйчук** | **30** |
| **Г. Нехнядовіч** | **30** |
| **Ю. Пятроўскі** | **30** |
| **Н. Ратош** | **30** |
| **Т. Саланко** | **30** |

**Шчыры дзякуй!**

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы аплату гадавой падпіскі (**$30**) на адрас:*
***P. O. Box 572, New York, NY 10113***
*Чэкі з адзнакай* ***"Весткі"*** *выпісвайце на імя* ***Valentina Balashchenko***
*Падпіску таксама можна аформіць, наведаўшы сайт* ***www.e-krama.com***
*Рэдакцыя бясплатна надрукуе прыватныя абвесткі і будзе ўдзячная за дасланыя артыкулы, водгукі й лісты.*
*Допісы накіроўвайце на адрас:*
***VIESTKI***
***P. O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***
*электронная пошта:* ***viestki@mail.com***